Источник: "Краязнаўчая газета" - 2015-03-26




# Пра аўтара нявыдуманых вершаў

***20 сакавіка ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа НАН Беларусі адбылася сумесная імпрэза Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры і бібліятэкі «Мы свет нанова адкрывалі...», прымеркаваная да 95-годдзя з дня нараджэння паэта Аляксея Пысіна.***

А. Пысін належыць да франтавога пакалення пісьменнікаў, такіх, як М. Аўрамчык, А. Вялюгін, К. Кірэенка, В. Быкаў і інш. Гвардыі радавы Пысін прайшоў усю вайну сувязістам, удзельнічаў у баях на пяці франтах, двойчы быў цяжка паранены. Узнагароджаны медалямі, у тым ліку медалём «За адвагу». Вайна пакінула незабыўны след у памяці паэта, стала цэнтрам яго творчасці. Матыў памяці, «пабрацімства мёртвых і жывых» праходзіць праз лепшыя паэтычныя творы А. Пысіна. «Кожны мой верш, – сведчыў ён, – мае біяграфію, нічога няма выдуманага».

Пяру паэта належыць больш за дваццаць кніг вершаў. Першы зборнік «Наш дзень» выйшаў у 1951 г., у 1959 г. з'явілася кніга «Сіні ранак», потым – «Сонечная паводка» (1962), «Мае мерыдыяны» (1965) і інш.

Да мерапрыемства супрацоўнікі бібліятэкі падрыхтавалі выстаўку «Мне ў жыта хочацца ўвайсці, мне вечнасцю здаецца жыта... », дзе сабраныя асноўныя творы А. Пысіна і іх пераклады на іншыя мовы. Асобным раздзелам прадстаўленыя літаратурна-крытычныя працы, а таксама літаратура аб жыцці і творчасці паэта.

*Лідзія ШАГОЙКА,*
*супрацоўніца Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры*
*Ніна КАМАРОВА, супрацоўніца ЦНБ НАН Беларусі*

Лідзія Шагойка, Ніна Камарова. Пра аўтара нявыдуманых вершаў